<u>**Гульня “Каляндар народнай лялькі”**</u>



**Аўтар: Варошка Вольга Станіславаўна,** выхавальнік дашкольнай адукацыі дзяржаўнай ўстановы адукацыі “Яслі-сад № 24 г. Ліда”.

**Мэта гульні:** фарміраванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту ўяўленняў пра народныя святы, абрады, традыцыі.

**Варыянты гульняў**



***Дыдактычная гульня “Калі гэта бывае?”***

***Мэта:*** замацаваць прыкметы пор года, традыцыі і абрады беларусаў.

***Матэрыял:*** гульня “Каляндар народнай лялькі”, народныя лялькі.



***Апісанне:*** Дзеці падбіраюць адпаведныя лялькі і прымацоўваюць іх да характэрных пор года. На кожную пару года падбіраецца лялька, якая звязана менавіта з гэтым месяцам, парой года.

***Дыдактычная гульня “Пара года”***



***Мэта:*** замацаваць уяўленні аб прыродных з’явах для ўсіх сезонаў года.

***Матэрыял:*** гульня “Каляндар народнай лялькі”, народныя лялькі.

***Апісанне:*** Педагог прапаноўвае разглядзець лялькі. Знайсці і падабраць ляльку да адпаведнай пары года. (Напрыклад, лялька “Вяснянка” прымацоўваецца да сакавіка, які выдзелены зялёным колерам, або лялька “Калядная каза” адпавядае студзеню і яе месца на сінім полі).

***Гульня “Знайдзі месца для лялькі”***



***Мэта:*** замацаваць уяўленні пра беларускія святы і абрады, уяўленні аб прыродных з’явах ва ўсе сезоны года.

***Матэрыял:*** гульня “Каляндар народнай лялькі”, народныя лялькі.

***Апісанне:*** Педагог прапаноўвае разглядзець “Каляндар народнай лялькі”, лялек, якія адапавядаюць кожнаму месяцу, потым лялькі здымаюцца, перамешваюцца, раздаюцца дзецям. Кожнае дзіця павінна знайсці месца для лялькі.

***Развіваючая гульня “Якая лялька схавалася?”***



***Мэта:*** замацаваць уяўленні аб народных святах і абрадах, развіваць увагу, мысленне.

***Матэрыял:*** гульня “Каляндар народнай лялькі”, народныя лялькі, хусцінка.

***Апісанне:*** Педагог разглядае з дзецьмі “Каляндар народнай лялькі”, прапануе ім заплюшчыць вочы. У гэты час хусцінкай закрывае адну з лялек і дзеці павінны здагадацца, якая лялька схавалася.

***Развіваючая гульня “Што змянілася? ”***



***Мэта:*** замацаваць уяўленні аб народных святах і абрадах, развіваць увагу, мысленне.

***Матэрыял:*** гульня “Каляндар народнай лялькі”, народныя лялькі.

***Апісанне:*** Педагог разглядае з дзецьмі “Каляндар народнай лялькі”, прапануе ім заплюшчыць вочы. У гэты час дарослы мяняе лялек месцамі і дзеці павінны здагадацца, што змянілася.

***Развіваючая гульня “Пазнай ляльку па апісанню”***



***Мэта:*** замацаваць уяўленні аб народных святах і абрадах, развіваць увагу, мысленне, актыўнае маўленне дзяцей, уменне складаць апісальны расказ пра цацку.

***Матэрыял:*** гульня “Каляндар народнай лялькі”, народныя лялькі.

***Апісанне:*** Педагог апісвае адну з лялек і прапануе дзецям здагадацца, аб якой ляльцы ідзе гаворка, а потым дзеці апісваюць народную ляльку, а астатнія дзеці пазнаюць ляльку па апісанню.

***Развіваючая гульня “Чаму так назвалі ляльку?”***



***Мэта:*** замацаваць уяўленні аб народных святах і абрадах, аб прыродных з’явах для ўсіх сезонаў года, развіваць увагу, мысленне, уменне прыдумваць падзеі, якія адпавядаюць пэўнай ляльцы.

***Матэрыял:*** гульня “Каляндар народнай лялькі”, народныя лялькі.

***Апісанне:*** Педагог паказвае дзецям ляльку, гаворыць яе назву, прапануе здагадацца і паразважаць, чаму так назвалі ляльку.

***Развіваючая гульня “Складзі расказ”***



***Мэта:*** замацаваць уяўленні аб народных святах і абрадах, развіваць увагу, мысленне, звязнае маўленне, уменне самастойна складаць расказ пра ляльку.

***Матэрыял:*** гульня “Каляндар народнай лялькі”, народныя лялькі.

***Апісанне:*** Педагог прапануе дзецям скласці расказ аб пары года і адпаведнай ляльцы гэтага сезона, традыцыях і абрадах беларусаў.

***Музычна-дыдактычная гульня “Поры года”***

***Мэта:*** замацаваць уяўленні аб народных святах, развіваць здольнасць да ўспрымання музычных вобразаў.
***Матэрыял:*** гульня “Каляндар народнай лялькі”, народныя лялькі, музычны твор цыкла “Поры года” П.Чайкоўскага.
***Апісанне:*** Дзецям прапаноўваецца паслухаць урывак з твора; вызначыць, якую пару года яны праслухалі; паказаць на календары; успомніць народныя святы гэтага сезона.

***Дыдактычная гульня “Падарункі для лялек”***



***Мэта:*** замацаваць уяўленні аб прыродных з’явах ва ўсе сезоны года.
***Матэрыял:*** гульня “Каляндар народнай лялькі”, народныя лялькі.
***Апісанне:*** Педагог прапаноўвае дзецям падрыхтаваць падарункі для лялек. (Напрыклад, для лялькі “Дамашняя масленка” – бліны, для лялькі “Птушка-радасць” – птушкі, для лялькі “Вялікдзень” – чырвоныя яйкі і г.д.).